# ЗАЎВАГІ ДА КАНСТРУКТЫВІСЦКАГА ПАДЫХОДУ Б. АНДЭРСАНА

**Атрохаў Дзяніс Анатольевіч,**
магістрант гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
**Бохан Францішак Юр'евіч,**
магістрант гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
Навуковы кіраўнік – Курбачова Вольга Ўладзіславаўна, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Анатацыя**. Вывучэнне нацый у навуковым асяроддзі – прадмет неспыняемых дыскусій, які цягнецца яшчэ канца XIX ст. Асабліва вялікія спрэчкі выклікае пытанне аб прыродзе з’явы нацый. Наконт гэтага пытання асабліва выдзяліліся дзве канцэпцыі – прымардыялісцкай і канструктывісцкая. Прымардыялісты прымрымліваюцца думкі аб існаванні нацый з антычных часоў, у той час як канструктывісты лічуць, што нацыі ўзніклі толькі ў XIX ст. На сённяшні дзень многія навукоўцы схіліліся ў бок апошняй канцэпцыі. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі даследаванні прыроды нацый у 1980-я гады, якое распачалося з манаграфіі Бенедыкта Андэрсана “Уяўныя супольансці”, якую некаторыя навукоўцы нават называюць “Бібліяй канструктывістаў”. У артыкуле даецца спроба разглядзець канструктывісцкія ідэі Б. Андэрсана, выказаных ім у працы “Уяўляльныя супольнасці”.

***Ключавыя словы***: нацыя; прымардыялізм; канструктывізм; Б. Андэрсан.

# REMARKS ON THE CONSTRUCTIVIST APPROACH OF B. ANDERSEN

**Atrokhau Denis A.**
Master's student of the History Department of BSU
**Bohan Frantisek Y.**
Master's student of the History Department of BSU
Scientific supervisor V. U. Kurbacheva
PhD in Philosophy, Cand.of Sciences, Department of Philosophy and Methodology of Science of BSU

**Abstract**. The study of nations in the scientific community has been a subject of ongoing debate since the end of the nineteenth century. On this issue, two concepts - primordialist and constructivist - have stood out. Primordialists are of the opinion that nations have existed since antiquity, while constructivists believe that nations emerged only in the XIX

century. Today, many scientists lean toward the latter concept. A big role in this was played by the research on the nature of nations in the 1980 s, which began with Benedict Anderson's monograph "imagined communities", which some scholars even call "the bible of constructivists". The article attempts to discern the constructivist ideas of B. Andersen. Andersen's constructivist ideas expressed in his work "representative communities".

**Keywords**: nation; primordialism; constructivism; B. Anderson.

XX-XXI ст. – перыяд глабалізацыі ў гісторыі чалавецтва. І ў гэты час, калі адбываецца трансфармацыя сацыякультурнай прасторы, стварэнне міжнародных арганізацый і распаўсюджванне наднацыянальных карпарацый, актуальнасць разумення што такое ёсць нацыянальная ідэнтычнасць толькі ўзрастае.

Вывучэнне нацый у навуковым асяроддзі – прадмет неспыняемых дыскусій, якія цягнецца яшчэ з канца XIX ст. Асабліва вялікія спрэчкі выклікае пытанне аб прыродзе з’явы нацый. У сучаснай навуцы маецца некалькі падыходы да даследавання нацыянальнай ідэнтычнасці: прымардыялізм, канструктывізм і інструменталізм [0, с. 55]. Прымардыялісты характарызуюць нацыянальную ідэнтычнасць як штосьці натуральнае, якое надаецца чалавеку па нараджэнню, без магчымасці змянення і з’яўляецца больш якасным узроўнем этнічнай ідэнтычнасць [0, с. 55]. Нацыянальная ідэнтычнасць разумецца як непазбежнае, натуральнае ўтварэнне, якое складаецца на падставе аб’ектыўных фактараў, да якіх адносяцца агульнае паходжанне груп насельніцтва, адзіная тэрыторыі, мова, рэлігія, традыцыі і г.д. Асновай для нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўляецца дух нацыі, голас крыві. Дадзены падыход развівалі такія даследчыкі, як К. Гірц, І. Гердэр, Дж. Інгер, І. Фіхтэ, Л.М. Гумілёў, Ю.У. Бромлей, Э.А. Пазнякоў і інш. Дадзены падыход крытыкуецца за абсалютызацыю аб’ектыўных фактараў складання этнанацыянальных супольнасцяў і ў адсутнасці дакладнага размежавання паміж этнасам і нацыяй.

Для канструктывізма нацыянальная ідэнтычнасць з’яўляецца штучным канструктам, які створаны чалавекам, пры гэтым адзначаецца працэсуальны характар і дыскурсіўная прырода нацыянальнай ідэнтычнасці [0, с. 289]. “Канструяванне” нацыянальнай ідэнтычнасці адбываецца ў перыяд змянення структуры грамадства, калі ў выніку мадэрнізацыі, індустрыялізацыі і развіцця капіталістычных стасункаў узнікае неабходнасць у новых формах салідарнасці і яднанне вялікіх груп

насельніцтва. Дадзены падыход развівалі Б. Андэрсан “Уяўныя супольнасці”, Э. Хобсбаум “Вынаходніцтва традыцый” і інш.

Для інструменталізцкага падыходу характэрны тэарэтычныя напрацоўкі канструктывізму [0, с. 289]. Асаблівасцю з’яўляецца ў тым, што нацыянальная ідэнтычнасць выступае ў якасці сродка групавой палітычнай мабілізацыі грамадства для дасягненне пэўных мэт. Прадстаўнікамі інструменталізму з’яўляюцца А. Коэн, М. Фішар, Д. Хоравіц і інш.

Зараз з’яўляецца відавочным, што ідэі прымардыялізма аб тым, што нацыянальная ідэнтычнасць не ёсць чымсьці пастаянным і не перадаецца ў крыві, не мае рацыі. Гэта пацвярджаецца тым, што ў наш час шэраг дзяржаў актыўна развіваюць міграцыю на сваю тэрыторыю, зменьваецца этнічны і расавы склад насельніцтва, але, у цэлым, нацыянальная ідэнтычнасць застаецца нязменнай.

Такім чынам, нацыянальная ідэнтычнасць у трактоўцы канструктывізм і інструменталізм з’яўляецца больш рэлевантнай. Відавочна, супольнасці такія як нацыі, якія складаюцца з вялікай колькасці людзей, дзе немагчыма быць знаёмым з кожным іншым прадстаўніком сваёй жа нацыі, аб’яднаныя чымсьці нематэрыяльным. Раней тое агульнае, што аб’ядноўвала мільёны людзей, звязвалі з менталітэтам ці нацыянальным духам. Зараз зразумела, што такія акалічнасці, як менталітэт ці нацыянальны дух, не з’яўляюцца рэчаіснасцю, а хутчэй апісваюць штосьці агульнае, што блізка большасці прадстаўнікоў той ці іншай супольнасці. Што ж тады яднае вялікія групы людзей?

Адно з цікавых разважанняў на гэты конт мае прадстаўнік канструктывізму Б. Андэрсан. У сваёй працы “Уяўныя супольнасці” Б. Андэрсан прапаноўвае разглядаць нацыі не як штосьці натуральнае, а як сукупнасць людзей, якія ўяўляюць сябе адзінным цэлым [0]. Звычайна гэта ўяўлення падмацоўваецца адзінай літаратурнай мовай і агульнымі звычыямі і традыцыямі. Уяўнымі такія супольнасьці з’яўляюцца, таму што цяжка знайсці тыя агульныя рысы, якія былі ўласцівы для ўсіх прадстаўнікоў супольнасці. Але пры гэтым агульнае ўсё ж такі ёсць. І гэтым агульным з’яўляецца ўяўлення аб тым, што ўсе людзі адной супольнасці чымсьці аб’яднаныя. Звычайна дадзенае ўяўлення грунтуецца на адной мове, культурных традыцыях, блізкасці матэрыяльнай культуры, але і гэтага можа быць недастаткова.

У якасці прыклада можна разгледзіць уласную гісторыю беларускага народу напрыканцы XIX – пачатку XX ст. Жыхар Заходняга Палесся і жыхар Паазер’я маглі лічыць сябе зусім чужымі адзін для аднаго. Яны мелі

featured

рознае адзенне, розную архітэктуру, вырошчвалі розныя сельскагаспадарчыя культуры, належылі да розных канфесій, у размове маглі не зразумець адзін аднаго. Але нягледзячы на ўсю розніцу яны лічылі сябе адзіным народам. Сакрэт гэтага крыецца ў тым, што абодва рэгіёна патрапілі пад адзін культурны ўплыў, а менавіта пад уплыў пісьмовага слова. На той час актыўна ідзе развіццё нацыянальнага друку, у большасці на беларускай мове, але часам і на польскай, і на рускай. І нацыя гэта ў першую чаргу размова пра друк і адукацыю. Дзякуючы пашырэнню адукацыі і развіццю нацыянальнага друку, які на падставе падабенству ў разгаворнай мове і блізкасцю тэм здолеў з’яднаць розных, хоць і блізкіх, людзей у адзіную супольнасць.

Менавіта друк стаў кропкай, з якой пачалося стварэння нацыі. Друк дае магчымасці зрабіць кнігу больш таннай і даступнай для большай колькасці людзей. Дзякуючы друку ідэі могуць распаўсюджвацца на вялікія адлегласці і на доўгія часы. Друк выпрацоўвае адзіныя моўныя нормы і стандарты, адначасова з’яўляючыся аднолькава блізкай і далёкай для кожнага з чытачоў. Такім чынам, друкаваны капіталізм ёсць магчымасць звязваць людзей адзінымі ідэямі, уяўленнямі, інфармацыйнай прасторай на вялікай адлегласці і на працягу часу.

Але канцэпныя Б. Андэрсана мае пэўныя хібы, у цэлым яго праца нясе вельмі шмат супярэчлівых. Найбольш паказальным з’яўялецца ўжо выказанае раней адсутнасць выразнага тлумачэнне аўтарам тэрміна “нацыя”. Тыя ж спробы апісаць якасці нацыі як суполкі таксама выклікаюць шмат пытанняў.

Па-першае, сцвярджаючы пра абмежаванне нацый, Б. Андэрсан аніяк не пісаў прызнакаў, па якім адныя нацыі адрозніваюцца ад іншых, кшталту той мовы ці этнаса. Аднак растлумачыць, што сабой канкрэтна ўяўляе нацыя, Б. Андэрсан так і не змог. Ва ўводзінах да кнігі даследчык вёў працяглыя, але па-сутнасці безвыніковыя разважанні адносна таго, чым з’яўляюцца нацыі, якія ён не змог сістэматызаваць у адно вызначэнне. Тым не менш, карыстаючыся найбольш выразна акрэсленымі тэзісамі даследчыка з уводзінаў, можна зрабіць выснову, што ў яго разуменні нацыя гэта “абмежаваная, сувярэнная і ўяўная супольнасць” [4, с. 19]. Абмежаванасць нацый Б. Андэрсан тлумачыць існаваннем яе выразных памераў, паколькі на яго думку “ніводная нацыя не ўяўляе сябе супаставімай з чалавецтвам” [4, с. 20]. Сувярэннасць нацый абгрунтоўваецца тым, што яны ўзніклі на базе вольных і незалежных дзяржаў. Уяўнасць нацый тлумачыцца тым, што ўсе людзі, прывязаныя да

пэўнай нацыі, фізічна не могуць быць знаёмымі паміж сабой. Гэта дае аўтару падставу меркаваць, што такім чынам у нацый няма паўнавартаснай еднасці.

Па-другое, тэзіс даследчыка аб фарміраванні нацый на падставе адной дзяржавы можна аспрэчыць існаваннем нацый умоўных баскаў, шатланцаў ці курдаў, якія не маюць незалежнасці, але жывуць адназначна абасоблена ад іншых жыхароў краіны, маюць свае культуры і імкнуцца ўтварыць свае дзяржавы (то бок, у гэтым выпадку нацыі сфарміраваліся раней за дзяржву).

Па-трэцяе, меркаванне аб ўяўнасці нацый у сувязі з адсутнасцю кантактаў паміж усімі яе ўдзельнікамі супярэчыць мінуламу тэзісу аб абмежаванасці. Калі нацыі маюць выразныя і неаспрачальныя нават самім аўтарам межы, то казаць аб іх уяўнасці абсалютна некарэктна, бо паказваеца канкрэтны факт іх існавання ў рэальным свеце.

Акрамя таго, пытанне выклікаюць меркаванні Б. Андэрсана аб моўным фактары ў развіцці нацый. Аўтар проста ігнаруе існаванне спецыфічны гаворак народнасцяў, пра якія ўзгадвае толькі пры тлумачэнні з’явы “друкарскага капіталізму” і такім чынам, звязвае развіццё нацыянальных моў з прыхацямі прадаўцоў друку ў XVII ст. Але гістарычныя факты паказваюць абсалютна супрацьлеглую карціну. Вялікі друк на нацыянальных мовах узнік ужо ў XIV ст. і выкарыстоўваўся ў першую чаргу не для продажы, а для рэлігійнай асветы нізавога насельніцтва. У якасці хрэстаматыйнага прыклада можна прывесці дзейнасць Ф. Скарыны ці іншых друкароў ВКЛ, якія ў падаўляючай большасці выдавалі творы на мясцовай мове.

Падобных супрэчнасцяў у кнізе можна знасці яшчэ шмат. Відавочна, што ствараюць канцэпыю паходжання нацый, як казаў Б. Андэрсан “якая адрозніваецца ад ліберальнай і марксісцскай”, бачна, што апошняя паўплывала на даследчыка ці нават была ўзятая як узор. Будуючы канцэпцыю, Б. Андэрсан часам падганяе пад яе некаторыя факты, а некаторыя – ігнаруе. Адназначнасць сведчанняў даследчыка тлумачыцца яго намаганнем утварыць універсальную схему зараджэння нацый, якая не заўсёды працуе (а часам не працуе зусім).

Але трэба падкрэсліць, што канструктывізм Б. Андэрсана стараецца пабудаваць нейкую схему працэса развіцця нацыянальнай свядомасці. Гэта выгадна яго адрознівае ад тых жа прымардыялістаў, якія не давалі яснага тлумачэння пра шлях утварэння нацый, проста выказваючы думку аб іх адвечным існаванні.

Такім чынам, канцэпнцыя Б. Андэрсана выразна акрэслівае нацыю як уяўную супольнасць, але не дае канкрэтнага тлумачэння што такое ёсць нацыя. Таксама прысутнічаюць недахопе ў апісанні працэсаў фарміравання нацый прапанаваных Б. Андэрсанам, хоць і мае гістарычныя абгрунтаванні і прыклады, але таксама не з’яўляюцца ўніверсальнымі і маюць шэраг выключэнняў і нараканняў. Галоўная перавага канцэпцыі Б. Андэрсана ў тым, што ў параўнанні з прымардыялісцкай тэорыяй, кажа аб нацыях неяк аб дадзенасці, а як аб пэўных супольнасцях, якія яднаюцца на падставе шэрагу фактараў. Але далей за гэтага ідэі Б. Андэрсан не выйшлі [0, с. 33]. Далейшае развіццё канструктывісцкага падыходу адбываецца ў працах А. Вімера, К. Чандры і Я. Варшавера, якія робяць спробу даць канструктывізму новыя мэты і метады.

**Спіс літаратуры**


1. Оспанов, Т. Т. Сущность и роль национальной идентичности в социальной философии / Т.Т. Оспанов // Вестник КазНУ Том 52 № 3 – Алматы, 2015. – С. 52-57.

2. Мёдова, Ю. А. О соотношении этнической и национальной идентичности /Ю.А. Мёдова// Философия и общество – Волгоград : «Учитель», 2010. – С. 119-125.

3. Туаева, К. Г. Философские основы национальной идентичности / К.Г. Туаева// Вестник университета № 8. – Москва: Издательский дом ГУУ, 2014. – С 287-292.

4. Андерсон, Б. Воображаемые сообщества. Размышления об истоках и распространении национализма / Б. Андерсон // пер. с англ .В. Николаева; Вступ. ст. С. Баньковской. — Москва: «КАНОН-пресс-Ц», «Кучково поле», 2001. — 288 с.

5. Варшавер, Е. А. «Перестать пинать мертвую лошадь примордиализма»: актуальные повестки дня в конструктивистских исследованиях этничности /Е.А, Варшавер// Социологическое обозрение Т. 21. №3 – Москва : ЦФС НИУ ВШЭ, 2022. – С. 31-58.

6. Львова, М. А. Сущность и содержание феномена национальной идентичности в современных философских, социальных и политических теориях : автореферат дис. кандидата философских наук : 09.00.11 / Помор. гос. ун-т им. М.В. Ломоносова. – Архангельск, 2004. – 23 с.